УДК 821.161.3-31.09

**Г.В. Навасельцава**
(Віцебск, Беларусь)

# РАМАН «КЕНТАЎРЫ» ВАСІЛЯ ГІГЕВІЧА ЯК ЭСТЭТЫЧНЫ ФЕНОМЕН

*Напрыканцы XX стагоддзя актывізуюцца эстэтычныя пошукі ў айчынным прыгожым пісьменстве, адбываецца жанравае абнаўленне ў тым ліку рамана. Адметным творчым водгукам на трагічныя наступствы Чарнобыльскай катастрофы з'яўляецца навукова-фантастычны раман «Кентаўры» Васіля Гігевіча, дзе ўвасабляецца вобраз сучаснага навукоўцы. Выхаваны як прагматык-матэрыяліст, пазбаўлены духоўнай спадчыны, галоўны герой спрабуе змадэляваць працэс развіцця чалавецтва, і гэта ў прычынах і наступствах асэнсоўваецца на ўзроўні філасофскай канцэпцыі. Яго трагічны лёс прымушае чатача задумацца пра неадназначны ўплыў навуковага прагрэсу на развіццё грамадства.*

У апошняе дзесяцігоддзе XX ст абнаўляецца жанрава-стылёвая палітра літаратуры, узмацняецца яе скіраванасць на паказ асобы, свядомасці чалавека. Значны ўплыў эстэтыкі гомацэнтрычнасці адчувае раман, у жанравай прыродзе якога закладзена адлюстраванне ўзаемаадносін асобы і грамадства. Абнаўленне жанру адбываецца праз акцэнтаванне інтэлектуальнага пачатку, павышаецца роля ўмоўнасці, асацыятыўнасці, аўтарскага падтэксту. Пісьменнік звяртаецца да чытача як раўнапраўнага ўдзельніка творчага працэсу, бачыць у ім сааўтара. У літаратурнай практыцы ўсё больш шырока выкарыстоўваюцца адметныя прыёмы постмадэрнісцкага пісьма.

Мастакі слова прад'яўляюць павышаныя патрабаванні да грамадскай актуальнасці ўласных твораў. Так, раман Васіля Гігевіча «Кентаўры» (1993) з'яўляецца творчым водгукам пісьменніка на трагічныя наступствы Чарнобыльскай катастрофы. Як слушна звяртае ўвагу С.А. Андраюк, непасрэднае знаёмства «з навуковымі данымі, з наступствамі неабачлівых навуковых эксперыментаў і практычных укараненняў не да канца правераных і апрабаваных навуковых ідэй не маглі не паўплываць на агульныя адносіны да сучаснай навукі, на трывожнае бачанне будучыні чалавецтва і чалавека»



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

[1, с. 833]. Навуковая фантастыка Васіля Гігевіча, працягвае даследчык, паказвае як неабмежаваныя навукова-тэхнічныя магчымасці сучаснага грамадства, так і спасціжэнне чалавека, працэс яго ўдасканалення. Нельга не пагадзіцца, што ў абодвух выпадках пісьменніка цікавіць найперш духоўны свет соцыуму і, варта дапоўніць, духоўны свет вучонага-эксперыментатара, які імкнецца перайначыць аснову, дзеля чаго робіць надзвычай смелыя крокі. Думаецца, у гэтым святле па-наватарску асэнсоўваюцца хрэстаматыйныя праблемы выбару і адказнасці, пошуку чалавекам спрадвечных ісцін, якія вырашальна ўплываюць на ўсю светапоглядную сістэму.

У рамане «Кентаўры» галоўным прадметам аўтарскай увагі выступае найперш вобраз галоўнага героя-навукоўцы. Васіль Гігевіч выбірае форму аповеду ад імя каментатара – між іншым, таксама прадстаўніка навуковай прафесіі, якому блізкія да разумення памкненні і праблемы калегі і якому перададзена значная мера аўтарскага аўтарытэту. Каментатар вядзе прыватнае расследаванне жыцця і дзейнасці біяфізіка Федарчука, не толькі знаёміць з гэтым героем маладасведчанага чытача, але і для сябе адкрывае шмат новага.

Дзеля большай ступені аб’ектыўнасці выкарыстаны эпісталярны прыём «запісной кніжкі», дзе ўтрымліваецца не толькі спецыфічныя навуковыя запісы, але і разгорнутыя замалёўкі з маленства, юнацтва, сталасці, што дазваляе прасачыць станаўленне і развіццё асобы. Напачатку чытач бачыць вясковага хлопчыка, для якога драўляная школа была тым, чым для яго бацькоў і дзядоў – царква. Ацэньваючы мінулае з вышыні часу, Федарчук прызнаецца, што «быў прыстойным вучнем, вучыўся на пяцёркі і ганарыўся сваім пазнаннем. І, канечне ж, лічыў сябе больш разумным за сваіх малаграматных бацькоў, якія нічагусенькі не кумекалі ў гэтых навуковых законах» [2, с. 51]. Не толькі сваёй асабістай праблемай, але і праблемай свайго пакалення галоўны герой лічыць тое, што сістэма адукацыі вылепіла з яго прагматыка-матэрыяліста з халоднай логікай.

У выніку прыходзіць час новай маралі, даказанай навуковымі законамі. Здавалася б, гэтыя законы павінны спрыяць як тэхнічнаму развіццю, так і духоўнаму ўдасканаленню грамадства. Аднак новая мараль, успрынятая ў форме лозунгаў «Хапай, як можаш, насалоду пры жыцці, бо пасля смерці нічога няма!», «Мы не можам чакаць літасці ад прыроды, узяць яе ў свае рукі – наша задача!», не мае нічога агульнага з духоўнай традыцыяй, штурхае на прагматычныя, карыслівыя ўчынкі.

У рамане паўстае сімвалічна шматзначны вобраз маленькага хлопчыка, пра якога гаворыцца, што ён з пасляваеннай напаўгалоднай вёскі, што ў яго пальцы запэцканы чарніламі, і што ён вельмі баіцца. Трагічна, што ўжо ў такім узросце хлопчык баіцца ўласнай смерці, якая адбудзецца яшчэ далёка няхутка, але ж адбудзецца, і гэты жах штурхае на пошукі, ён імкнецца зрабіць адкрыццё, каб паспець пераадолець гэту невырашальную праблему. Варта казаць пра іншасказальнае ўвасабленне дарослага пакалення, якім аказалася адпрэчанай вера ў духоўную несмяротнасць, у выніку чаго згубілася повязь з каранямі. З гэтага пакалення і выйшлі вынаходнікі-эксперыментатары, унутрана падрыхтаваныя змяняць і грамадства, і прыродны свет да непазнавальнасці.

У гэтым творы пісьменнік паказвае сябе яркім наватарам, увасабляе складаную прасторава-часавую арганізацыю, на сэнсаўтваральным узроўні выкарыстоўвае прыём правакацыі чытача. Напрыклад, каментатар зазначае, што стараецца як мага



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

менш выказвацца наконт запісаў Федарчука, якія вызначаюцца суб'ектыўнасцю, паколькі зроблены яшчэ напачатку перабудовы. Чытач разумее з запісной кніжкі галоўнага героя, што той не прымае многія ідэі гэтага грамадскага часу, з'яўляецца традыцыяналістам і нават кансерватарам у лепшым разуменні гэтага паняцця.

Федарчука раздражняюць і злуюць мітынгі нефармалаў, парнаграфічныя з'явы свабоднага мастацтва, якое стала вынікам «плюралістычнага бачання свету», доўгія чэргі ў магазіны, дзе ўзнікаюць сваркі, бывае, што і бойкі. Галоўны герой паказаны разважлівым, удумлівым, засяроджаным на сваёй справе чалавекам, які, разам з тым, здольны чуйна ўспрымаць акаляючы свет. З такой асобай чытач пачынае суадносіць лепшыя маральна-этычныя якасці, ставіцца з даверам да яе ўчынкаў, з павагай – да навуковай дзейнасці. Узнікае спадзяванне, што і са смелым эксперыментам павінна быць усё як след.

Напачатку мала насцярожвае спецыфічная Федарчукова прагавітасць, якая праяўляецца не ў палітычных патрабаваннях, не ў спажывецкіх інтарэсах, а ў навуцы. Пасля зацвярджэння праекта ў Акадэміі навук герой адчувае сябе сапраўдным пераможцам, пры гэтым перажывае неўласцівыя для такога стану пачуцці: «Я адчуў, што бяссонныя ночы, пакутлівыя дні, праведзеныя за рабочым сталом, у ціхай чытальнай зале бібліятэкі, глухое раздражненне і незадаволенасць на сябе, на сваё бяссілле разабрацца ў ланцугах формул, у лагічна-асацыятыўных сувязях, што нябачнымі ніткамі пранізваюць і яднаюць як жывую, так і мёртвую матэрыю – гэтае бяссілле і незадаволенасць сабою паступова і непрыкметна пераліваліся з маёй душы чортведама на каго, здаецца, ці не на горад, які здаваўся змрочным і бяссэнсным, прапітаным людской чэрствасцю і эгаізмам» [2, с. 25]. Трывожнае прадчуванне, што герой не ведае меры, падрыхтоўвае ўспрыманне кульмінацыі рамана – непасрэдна рэалізацыі эксперымента.

Праз спасціжэнне духоўнага свету асобы пісьменнік раскрывае навукова-фантастычную інтэрпрэтацыю грамадскай рэчаіснасці, мадэлюе яе актуальныя праблемы ў створанай вымыслам рэальнасці. Паслядоўна паказвае развіццё апошняй як верагоднай для чалавечага грамадства, чым заяўляе арыгінальную філасофскую канцэпцыю. Дзеля ажыццяўлення праекта пабудаваны цэлы гарадок, дзе працуюць навукоўцы, якія паводзяць сябе, як і звычайныя людзі: сварацца з жонкамі, вырашаюць побытавыя праблемы і інш.

Знакава, што эксперымент не мае ніякага поспеху, пакуль не ўмешваецца звышчалавечая прыродная сіла – маланка. Калі ж на Базе кентаўраў ажывае міф, Федарчук адчувае не радасць, а трывогу, паколькі тыя з'явы, якія ён назірае ў лабараторных умовах, у вялікім маштабе адбываюцца ў рэальным грамадстве. Развіццё кентаўраў паскорана паўтарае эвалюцыю чалавецтва, у прыватнасці, напачатку даследчыкі са шкадобай назіраюць, як кентаўры змагаюцца адзін з адным. Пазней здзіўляюцца, бо кентаўры, якія навучыліся будаваць самалёты, падлятаюць да ілюмінатараў, за якімі знаходзяцца іх стваральнікі, і ўзіраюцца ў шкло. А яшчэ пазней, калі кентаўры спрабуюць прабіваць ілюмінатары, вымушаны прыняць рашэнне знішчыць сваіх створаных братоў па розуме.

Апошняе рашэнне маральна знішчае самога Федарчука, які задаецца пытаннямі, адрасаванымі чытачу: «Што творым мы на Зямлі сваёй тэхналагічнай дзейнасцю?»



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

[2, с. 157] і «Ці не з’яўляемся мы самымі жахлівымі шкоднікамі на яе агромістым целе?..» [2, с. 157]. З мажлівых адказаў паўстаюць новыя пытанні, якія гучаць як папярэджанне ўсім навукоўцам, якія ўзялі на сябе ролю Бога. Рацыяналіст-Федарчук урэшце сумняваецца: «Няўжо і сапраўды маюцца межы пазнання, за якія чалавеку са спагененай душою нельга заступаць?» [2, с. 160]. Перад заўчаснай смерцю вучоны разважае над пытаннямі, што ёсць чалавек і ягонае жыццё, што ёсць смерць, што ёсць вечнасць і бессмяроцце і прызнаецца, што ён так нічога і не ўведаў.

Структурна аповед пабудаваны такім чынам, што пісьмовыя запісы пра эксперымент і яго вынікі, заключныя філасофскія разважанні робяцца Федарчуком тады, калі ён ужо прызнаны псіхічна хворым. Як бачым, аўтар не настойвае на сваёй маральнай праваце, не навязвае сваёй думкі чытачу. Федарчук успрымаецца як адзін з многіх вучоных, дзіця свайго часу, які імкнуўся вырашыць праблемы павышанай значнасці, але вынікі яго дзейнасці прынеслі толькі шкоду. Верагодна, гэта адбылося таму, што галоўны герой з дзяцінства быў пазбаўлены сапраўднай духоўнасці, вытокі якой – у маральнай спадчыне, пераемнасці пакаленняў.

Каментатар, захоўваючы знешнюю аб’ектыўнасць, падае вычарпальныя звесткі, дастатковыя для высвятлення маральна-этычнай ацэнкі, што ў нейкай ступені дае мажлівасць назваць твор аўктарыяльным раманам. Разам з тым трагічны лёс галоўнага героя прымушае чатача задаваць пытанні пра ўплыў навуковага прагрэсу на развіццё грамадства, асэнсоўваць неадназначную ролю навукі, актывізуе ўдумлівы пошук прычын і наступстваў культурна-сацыяльных праблем.

**Спіс літаратуры**

1. Андраюк, С.А. Васіль Гігевіч / С.А. Андраюк // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Цэнтр даслед. беларус. культуры мовы і літ. ; навук. рэд. У.В. Гніламёдаў, С.С. Лаўшук. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – Т. 4, Кн. 3. – С. 806–835.

2. Гігевіч, В. Кентаўры : раман, аповесці, апавяданне / В. Гігевіч. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 333 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова